УДК 726.5.04 (476)

**Малітоўная зала ў структуры сучаснага праваслаўнага храма Беларусі**

Арабей В. Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Малітоўная зала з’яўляецца асноўным элементам аб’ёмна-планіровачнай структуры прыходскага праваслаўнага храма і яе цэнтрам пры ўсіх варыянтах кампазіцый. Яна, як правіла, мае большую вышыню, параўнальна з памяшканнямі іншага прызначэння, і розныя варыянты канфігурацый планаў. З поўначы і поўдня адносна малітоўнай залы часам ствараюцца прыдзелы, якія могуць мець як меншую, так і аднолькавую з асноўным аб’ёмам вышыню. Аналагічная сітуацыя назіраецца пры ўладкаванні апсіды з усходу і бабінца з захаду, з той розніцай, што над бабінцам, як правіла, размяшчаюцца хоры.

Абавязковым патрабаваннем з’яўляецца пабудова кубападобнага аб’ёма малітоўнай залы, што грунтуецца на сімвалічным тлумачэнні цэнтральнай часткі храма як створанага свету. Паўсфера найлепшым чынам адпавядае нябёсам – духоўнаму свету, таму часта выкарыстоўваецца для завяршэння цэнтральнай і алтарнай частак.

У ходзе даследавання было выяўлена 4 варыянты размяшчэння малітоўных залаў і прыдзелаў у сучаснай практыцы прыходскага храмабудавання: 1) у сярэдняй частцы; 2) у бакавых частках; 3) на розных узроўнях; 4) прыбудаваныя.

Размяшчэнне малітоўнай залы ў сярэдняй частцы ўласціва для ўсіх прыходскіх храмаў, але абмяжоўваюцца названым рашэннем толькі малыя і сярэднія. Аналіз сучаснага храмабудаўніцтва Беларусі паказвае абмежаванае размяшчэнне прыдзелаў у бакавых частках цэркваў. У асноўным такі падыход распаўсюджаны ў прыходскіх цэрквах і саборах вялікіх і буйных гарадоў, дзе могуць служыцца некалькі літургій у адзін дзень.

Параўнальна з папярэднім варыянтам, размяшчэнне малітоўных залаў на розных узроўнях атрымала шырокае выкарыстанне ў сучасным храмабудаўніцтве. Аргументамі на карысць ужывання названага падыходу з’яўляюцца невялікі кошт, кампактнасць, зручная функцыянальная арганізацыя, узбуйненне аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі храма, магчымасць размяшчэння на ніжнім узроўні памяшканняў іншага прызначэння.

Прыбудаваная малітоўная зала была выяўлена толькі ў адным праекце пашырэння храма, але гэта можна патлумачыць дастаткова невялікім перыядам развіцця сучаснага храмабудаўніцтва. У будучым названы падыход можа атрымаць распаўсюджанне ў выніку разгортвання прыходскай дзейнасці.